# МУЗЕЙНАЯ АДУКАЦЫЯ: НАПРАМКІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

**М. А. Бяспалая**, *загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для забеспячэння паспяховай адаптацыі будучых музейных супрацоўнікаў да практычнай дзейнасці неабходна вырашаць праблемы іх падрыхтоўкі. Відавочна, што дасягненне аптымальнага спалучэння тэорыі і практыкі з'яўляецца пастаяннай праблемай для кожнай галіны навукі, яе канчатковае вырашэнне – гэта ідэал, да якога імкнецца чалавецтва. Пэўнае месца ў працэсе падрыхтоўкі будучых музейных спецыялістаў займае створаная ў 1994 г. кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Арганізацыя кафедры адбылася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай тэндэнцыі, што праявілася каля 40 гадоў таму назад са з'яўленнем першых навучальных устаноў у галіне музеязнаўства. У 1980-я гг. у гэты працэс уключылася Расійская Федэрацыя, сёння такіх вучэбна-метадычных цэнтраў каля 600.

Важнейшай задачай кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, безумоўна, з'яўляецца падрыхтоўка высокаадукаваных і высокапрафесійных музейных спецыялістаў. Несумненна, што не аднойчы ўзнікалі пытанні: якім павінен быць, якімі навыкамі і ўменнямі павінен валодаць такі спецыяліст? Заўважым, што гэтыя пытанні хвалююць усю музейную супольнасць. Міжнародны камітэт па падрыхтоўцы персаналу (ICTOP) пры Міжнародным савеце музеяў (ІКОМ) не так даўно зацвердзіў рэкамендацыі, якія ўключаюць каля 12 пазіцый адносна прафесійнага фарміравання музейных работнікаў і прадугледжваюць наступнае: яны павінны дэманстраваць навыкі і веды, пачынаючы з міжкультурных камунікацый, аховы наваколля і заканчваючы барацьбой за мір.

У сусветнай музейнай практыцы існуе ўяўленне аб музейным супрацоўніке, які павінен быць спецыялістам у пэўнай галіне ведаў, і пасля працяглай адаптацыі ў музейным асяроддзі з яго можа атрымацца высокакласны прафесіянал. Да апошняга часу аўтар артыкула таксама прытрымліваўся традыцыйнага ўяўлення аб асобе

музейнага супрацоўніка, чаму надаваў грунтоўнасць 8-гадовы вопыт працы аўтара ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак знаёмства з сучаснымі тэндэнцыямі ў музейнай справе, навуковымі і практычнымі распрацоўкамі ў гэтай галіне стварыла неабходны падмурак для перагляду сталага пункта гледжання.

Адзначым, што сацыяльна-культурная сітуацыя, у якой дзейнічаюць музеі, кардынальна змянілася. Перш за ўсё змяніўся кантынгент наведвальнікаў, іх інтэлектуальны ўзровень і методыка засваення новых ведаў, матывацыя іх набыцця. У значнай ступені гэта абумовіла пераход ад традыцыйнай у сваёй аснове арганізацыі экспазіцыйнай прасторы да перамяшчэння ў цэнтр увагі асобы наведвальніка і ўключэння яго ў музейную дзею. Для сучасных школьнікаў, студэнтаў, складаючых асноўную частку арганізаваных наведвальнікаў, удзел у інтэрактыўных ці тэатралізаваных формах засваення інфармацыі з'яўляецца арганічным, зразумелым і пажаданым. І хаця аўтар прытрымліваецца традыцыйнага падыходу да музейнай экспазіцыі, які вымагае ад наведвальніка мабілізацыі інтэлектуальных магчымасцей, неабходна прызнаць, што дыялагічны падыход да прэзентацыі экспазіцыі кардынальна закранае тэорыю і практыку экспанавання і музейнай справы ў цэлым. За гэтым кірункам будучае, і ён вымагае адпаведных падыходаў у падрыхтоўцы спецыялістаў музейнай справы.

У сувязі са сказаным вышэй, мы лічым праванмерным увядзенне ў вучэбны план такіх дысцыплін, як музейная педагогіка, маркетынг, менеджмент, таму што без адпаведных ведаў сучасны музейны спецыяліст не можа адбыцца. Вучэбны план кафедры, які складзены на падставе дзяржаўнага стандарту і вучэбных планаў, распрацаваных кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ, прадугледжвае выкладанне гэтых дысцыплін. Аднак асноўнымі дысцыплінамі ў падрыхтоўцы музейнага спецыяліста з'яўляюцца, на наш погляд, спецыяльныя дысцыпліны – захаванне і кансервацыя, камплектаванне і ўлік фондаў, экспазіцыйна-выставачная і культурна-адукацыйная дзейнасць, тэорыя і практыка экскурсійнай работы і інш. Вучэбны план прадугледжвае значную колькасць гадзін на блок гістарычных дысцыплін – гісторыя Беларусі, замежных краін, краязнаўства, тэорыя і гісторыя культуры, а таксама – этнаграфія, археалогія, архітэктура. Каб пашырыць кругагляд нашых студэнтаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актывізаваць іх зацікаўленасць і ініцыятыву, мы прапануем значную колькасць курсаў па выбары ці курсаў Савета ВНУ, сярод іх лацінская, польская, сцэнічная мова, палеаграфія, кадыкалогія, ці гісторыя кнігі, генеалогія, гістарычная геаграфія і іншыя не менш цікавыя дысцыпліны. Калі лічыць, што такі шырокі набор прадметаў заклікан абуджаць зацікаўленасць, крэатыўнасць студэнтаў, то ён жа стварае і грунтоўны падмурак для далейшага ўдасканалення ўменняў і навыкаў маладога спецыяліста. Без гэтага далейшае развіццё музея немагчыма, таму што музей ёсць установа, якая аб’ядноўвае не толькі музейныя прадметы, але і людзей з іх ведамі і крэатыўнымі ідэямі, і ўся яго дзейнасць павінна быць накіравана на актывізацыю камунікатыўных стасункаў.

Мы не будзем спыняцца на методыцы выкладання, якая ўжываецца на кафедры, адзначым толькі, што выкладчыкі імкнуцца выкарыстоўваць самыя разнастайныя сучасныя методыкі і тэхналогіі. Як адзін з найважнейшых метадычных кірункаў у падрыхтоўцы спецыялістаў мы разглядаем музейную практыку – азнаямляльную, фондавую і экскурсійную, якую студэнты праходзяць пачынаючы з другога курса ў розных музеях Мінска, у асобных выпадках – па месцы жыхарства.

Важным этапам падрыхтоўкі спецыялістаў да практычнай дзейнасці, асабліва да азнаямлення з асновамі навуковай работы, з’яўляецца напісанне курсавых і дыпломнай работы, тэматыка якіх адпавядае асноўным кірункам і сучасным тэндэнцыям у музейнай практыцы. Для выпускнікоў, якія праявілі здольнасць да навуковай дзейнасці, пры кафедры працуюць магістратура і аспірантура, і першыя вынікі відавочны – абарона і зацвярджэнне кандыдацкай дысертацыі Т. А. Джумантаевай, праходжанне яшчэ дзвюх дысертацый праз папярэдні этап абароны. Выпускнікі кафедры абараняюць дысертацыі і на іншых навуковых спецыяльнасцях, напрыклад, у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі нашым выпускніком была абаронена кандыдацкая дысертацыя па археалогіі.

Немалаважнае значэнне для падрыхтоўкі маладых спецыялістаў набываюць экскурсіі ў музеі Мінска і рэспублікі і на аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны. Толькі за 2011 г. студэнты пабывалі на экскурсіях ў Магілёве, Гальшанах, Гродна, Лідзе і фактычна ва ўсіх сталічных музеях рознай прыналежнасці і профілю. Гэтая практыка, а таксама шчыльнае знаёмства з дзейнасцю рэгіянальных музеяў дазволілі кафедры прыйсці да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высновы аб неабходнасці адкрыцця падрыхтоўкі спецыялістаў па напрамку «гісторыка-культурная спадчына і турызм» з прысваеннем кваліфікацыі «менеджар па культурнай спадчыне і турызму».

Лічым неабходным спыніцца на выкладчыцкім складзе кафедры, таму што ад яго кваліфікацыі непасрэдна залежыць узровень падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. На наш погляд, ён аптымальны, бо ўсе выкладчыкі музейных дысцыплін маюць вопыт практычнай дзейнасці ў музеях ці ў сістэме аховы гісторыка-культурнай спадчыны, удзельнічалі ў этнаграфічных экспедыцыях і археалагічных раскопках, ажыццяўляюць актыўную навукова-даследчую работу па індывідуальных тэмах і дзвюх кафедральных, у тым ліку адной у межах Дзяржаўнай праграмы «Культура». Навуковае заданне, якое выконвае калектыў кафедры, датычыцца дзейнасці рэгіянальных музеяў.

Кафедра падтрымлівае цесныя сувязі з выпускнікамі, якія працуюць у многіх музеях рэспублікі, сярод іх дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Г. У. Савіцкі, дырэктар Вілейскага краязнаўчага музея С. М. Ганчар, дырэктар Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя К. і Я. Тышкевічаў С. М. Жыгунова і інш. Кафедра лічыць неабходным падтрымліваць прафесійныя сувязі з многімі музеямі Мінска і краіны.

Спалучэнне ўсіх кірункаў дзейнасці кафедры, якія закрануты ў артыкуле, можна разглядаць як грунтоўны падмурак для фарміравання ў выпускнікоў прафесійных уменняў і навыкаў, далучэння іх да сучасных тэндэнцый у музейнай справе – музейнага менеджменту і маркетынгу, музейнай педагогікі, арганізацыі сучасных выстаў і экспазіцый, авалодванне музейнымі інфармацыйнымі тэхналогіямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ